**Білет 25**

**Практычнае заданне.**

**Усходнія славяне на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, асноўныя заняткі, племянныя княствы, кіраванне імі.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце саюзы ўсходнеславянскіх плямёнаў, якія склаліся ў VIII–IX стст. на тэрыторыі Беларусі.
2. Ахарактарызуйце геаграфічнае становішча саюзаў славянскіх плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў VIII–IX стст.
3. Аб якіх гаспадарчых занятках усходніх славян дазваляе зрабіць вывады ілюстрацыя? Назавіце не менш за пяць заняткаў.
4. Складзіце схему “Арганізацыя ўсходнеславянскага грамадства ў VIII–IX стст.».

**I. Картасхема. Усходнеславянскія саюзы плямёнаў на тэрыторыі Беларусі ў VIII–IX стст.**




**II. Племянныя княжанні – крок да дзяржавы** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. 6 клас»)*

Славянскія саюзы плямёнаў, у якіх існавала ўлада князя, гісторыкі называюць *племяннымі княжаннямі*. У іх яшчэ захоўваўся народны сход - *веча*.

Але найбольш важныя рашэнні прымаліся князем і племяннной знаццю. Згодна з летапісам племяннное княжанне было ў палачан і дрыгавічоў.

Славянам, якія перасяляліся на новыя землі, даводзілася часта ваяваць. Войны былі больш паспяховымі, калі на чале войска аказваўся таленавіты кіраўнік. Такога племяннога правадыра славяне называлі *князем*. Яго выбіралі з ліку знатных людзей. Князь арганізоўваў абарону сваіх супляменнікаў ад нападаў ворагаў.

У асяроддзі князя паступова складалася група яго пастаянных баявых паплечнікаў і дарадцаў - *дружына*. Гэтыя людзі жылі побач з князем, дапамагалі яму ва ўсіх ягоных справах. Князь забяспечваў іх усім неабходным, даваў коней і зброю. Дзякуючы дружыне ўмацоўвалася ўлада князя сярод насельніцтва.

Колькасць дружыннікаў была не вельмі значнай. Для вядзення вялікіх войн усім мужчынам прыходзілася браць у рукі зброю. Яны складалі ваеннае *апалчэнне*. І земляроб, і рамеснік падчас вайны ператвараліся ў воінаў. Але ваеннае апалчэнне не было такім жа моцным на полі бою, як княжая дружына.

Спачатку князь у славян быў толькі вайсковым правадыром. Яму падпарадкоўваліся падчас вайны. Усе важныя справы ў славянскім племені вырашаліся на народным сходзе - *веча*. У вечы мог удзельнічаць кожны вольны мужчына. Веча магло разглядаць любыя пытанні. Але часцей за ўсё супляменнікі збіраліся толькі для разгляду найбольш важных спраў. Да іх адносіліся пытанні вайны і міру. На веча з ліку знатных людзей абіраўся князь. Да веча чалавек мог звярнуцца ў пошуках абароны і справядлівага суда.

З часам пастаяннае кіраванне племем перайшло да князя.

**III. Заняткі ўсходніх славян.**

